# Да краязнаўчага форуму — менш за тыдзень

Праз некалькі дзён пачнецца I Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі, арганізатарамі якога выступаюць Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь і ГА «Беларускі фонд культуры» пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Форум праводзіцца ў партнёрстве з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Рэдакцыйна-выдавецкай установай «Выдавецкі дом "Звязда"». Пройдзе ён на базе Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь па адрасе: г. Мінск, вул. К. Маркса, 12.

Мяркуецца, што ў мерапрыемстве возьмуць удзел больш за 250 краязнаўцаў і навукоўцаў з розных мясцінаў Беларусі.

Ніжэй падаем папярэдні план Форуму (у ім магчымыя змены, аб якіх удзельнікі даведаюцца дадаткова).

Пад час Форуму будзе разгорнутая выстаўка краязнаўчай літаратуры і лепшых краязнаўчых выданняў, прадстаўленых на рэспубліканскі конкурс краязнаўчай літаратуры рэгіёнаў краіны.

**12 сакавіка**
10.00 – 11.00 – рэгістрацыя ўдзельнікаў.
11.00 – 13.00 – пленарнае пасяджэнне.
13.00 – 14.00 – перапынак.
14.30 – 18.30 – праца секцый:
«Краязнаўства ў сістэме навукова-даследчай працы»;
«Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ўстаноў адукацыі»;
«Экалагічнае краязнаўства і турыстычная дзейнасць»;
«Моладзь і краязнаўства»;
«Асоба ў краязнаўстве: з гісторыі біяграфій беларускіх краязнаўцаў»;
канферэнцыя школьнікаў «Пазашкольнае краязнаўства: вопыт рэгіёнаў».

**13 сакавіка**
09.30 – 12.30 – праца секцый.
13.00 – 14.00 – перапынак.
14.00 – 16.30 – фінальнае пасяджэнне, падвядзенне вынікаў форуму і конкурсу кніг.

*Рэдакцыя «Краязнаўчай газеты»*